Варта адзначыць, што арт. 273 КПК 1960 г. не прадугледжваў магчымасці заявіць адвод грамадскаму абвінаваўцу, што адрознівала яго ад пракурора.

Згодна з арт. 280 КПК 1960 г., прапановы грамадскага абвінаваўцы і грамадскага абаронцы ўлічваліся пры ўстанаўленні парадку даследавання доказаў.

Паводле арт. 297 КПК 1960 г. грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца мелі магчымасць заявіць хадайніцтвы аб дапаўненні судовага следства пасля даследавання ўсіх прадстаўленых доказаў.

На падставе арт. 249 і 298 КПК 1960 г. грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца прымалі ўдзел у судовых спрэчках, дзе выступалі з прамовай. Варта звярнуць увагу, што палажэнні арт. 249 КПК 1960 г. акрэслівалі кола пытанняў, якія маглі закрануць грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца ў сваёй прамове.

У арт. 315 КПК 1960 г. прадугледжвалася, што суд пры складанні ўводнай часткі прысуду быў павінен адзначыць у якасці ўдзельнікаў грамадскага абвінаваўцу і грамадскага абаронцу, што яшчэ раз падкрэслівала наяўнасць самастойнага працэсуальнага становішча грамадскага абвінаваўцы і грамадскага абаронцы.

Як удзельнікі крымінальнага працэсу, грамадскія абвінаваўцы і грамадскія абаронцы прымалі ўдзел у разглядзе спраў у судзе першай інстанцыі, і толькі на гэтым этапе маглі карыстацца роўнымі з іншымі ўдзельнікамі правамі. Але яны не мелі права абскардзіць прысуд у выпадку нязгоды з ім.

Такім чынам, грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца з'яўляліся самастойнымі ўдзельнікамі крымінальнага працэсу, якія выконвалі крымінальна-працэсуальныя функцыі абвінавачвання і абароны ад імя грамадскасці. Для іх належнага здзяйснення крымінальна-працэсуальнае заканадаўства надзяляла грамадскага абвінаваўцу і грамадскага абаронцу даволі шырокім колам правамоцтваў. Але ўдзел грамадскага абвінаваўцы і грамадскага абаронцы ў крымінальным працэсе абмяжоўваўся толькі разглядам крымінальных спраў у судзе першай інстанцыі.

***Кузурава Д. Д.***

## ПРАВАВЫ СТАТУС ЖАНЧЫНЫ Ў СТАТУТАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

*Кузурава Дар'я Дзмітрыеўна, студэнтка 2 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, law.kuzuroba@bsu.by*

*Навуковы кіраўнік: канд. юрыд. навук, дацэнт Голубева Л. Л.*

У Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) жанчынам надавалася вялізарная свабода: яны мелі права на маёмасць і спадчыну, на абарону ад гвалту. Першыя кадыфікаваныя прававыя акты, Статуты, з'яўляліся падмуркам для рэалізацыі жанчынай сваіх правоў.

Згодна з артыкуламі Статутаў ВКЛ жанчына-шляхцянка знаходзілася пад апекай усё жыццё (арт. 8 раздз. V Статута 1529). Асноўнымі абавязкамі апекуна былі прадстаўленне і абарона інтарэсаў жанчыны, а таксама распараджэнне яе маёмасцю. Аднак судовыя пазовы, акты запісаў маёмасці, тэстаменты і г. д. паказваюць, што дэ-юрэ бяспраўныя жанчыны самастойна вырашалі свае праблемы. З набыццём рэальных грамадзянскіх правоў і свабод звязвалі наступленне паўналецця. Так, тэрмін паўналецця па Статуту 1529 г. для дзяўчын быў вызначаны – 15 гадоў (арт. 18 раздз. I), па Статуту 1566 г. – таксама 15 гадоў (арт. 32 раздз. III), па Статуту 1588 г. – 13 гадоў (арт. 1 раздз. VI).

Асаблівая ўвага надавалася інстытуту спадчыннага права, у прыватнасці вена, якое бярэ свой пачатак яшчэ з прывілея Ягайлы 1387 г. і знаходзіць свой працяг ў Статуце ВКЛ 1529 г. Вена ўяўляла сабой матэрыяльнае забеспячэнне жонкі, якое павінен быў выплаціць муж ў пакрыццё занесенага жонкай пасага. Бацька, які выдаваў дачку замуж, не толькі павінен быў забяспечыць яе пасагам, але і патрабаваў ад зяця перш «вено оправити». У Статуце 1529 г. гаварылася: «А естли бы хто дочку выдал замуж, а вена ей не оправивши, тогды тая девка не маеть венца мети» (арт. 8 раздз. IV).

Маёнтак па матчынай лініі дзяліўся пароўну паміж усімі дзецьмі, а маёнтак па бацькоўскай лініі размяркоўваўся толькі паміж сынамі, дачкам ад бацькі даставаўся толькі пасаг (арт. 12 раздз. IV Статута 1529). Пасаг складаў чвэрць ад усёй маёмасці і выплочваўся ўсім дачкам ў сям'і незалежна ад іх колькасці (арт. 7 раздз. IV Статута 1529), таму нельга сцвярджаць пра абмежаванне права жанчыны на атрыманне спадчыны.

Статуты 1566 і 1588 гг. дублявалі палажэнні папярэдняга Статута і дэталізавалі спадчынныя адносіны. Варта таксама адзначыць, что раздзел III Статута 1566 г., які тычыўся спадчынных адносін, атрымаў назву «О вольностях шляхецких и о розмноженью Великого князства Литовского», што азначала яго нераспаўсюджванне на жанчын простага становішча.

Немалаважным з'яўляецца пытанне аб становішчы жанчыны-ўдавы, так як яе прававы статус лічыўся лепшым, чым прававы статус замужняй жанчыны альбо незамужняй дзяўчыны. Бяздзетная ўдава без вена атрымлівала частку маёнтка мужа, але не больш за трэцюю частку, у пажыццёвае валоданне (арт. 2 раздз. IV Статута 1529), астатнія дзве часткі пераходзілі да бліжніх мужа, а ў выпадку смерці – уся маёмасць (арт. 5 раздз. IV Статута 1529). Калі ўдава мела вена, то яна мела права толькі «на вене осести» (арт. 1, 2 раздз. IV Статута 1529). Але ў далейшым правы ўдавы абмяжоўваліся.

Раней вялікія князі ВКЛ актыўна ладзілі шлюбы сваіх падданых, спалучаючы іх па сваім меркаванні, аднак ужо Статут 1529 г. устанаўліваў: удоў і дзяўчын не выдаваць замуж супраць іх волі (арт. 18 раздз. IV Статута 1529). У Статутах 1566 і 1588 гг. дадзенае становішча распаўсюдзілася і на асоб «всякого иного стану».

Аднак дзяўчына не магла выйсці замуж без згоды на тое бацькоў або апекуноў, інакш яна губляла спадчынныя маёнткі і правы на атрыманне

пасага. Пачынаючы са Статута 1566 г., аналагічныя наступствы вынікалі і ў тым выпадку, калі шляхцянка выходзіла замуж за чалавека «простага стану» (арт. 11 раздз. V Статута 1566, арт. 12 раздз. V Статута 1588). Неабходна адзначыць, што незаконнасць такога шлюбу не прызнавалася.

У Статутах ВКЛ таксама прасочваецца асаблівая тэндэнцыя аховы жанчын крымінальна-прававымі нормамі. Статут ВКЛ 1588 г. усталёўвае шэраг спецыяльных саставаў злачынстваў з адказнасцью ад двайной галаўшчыны да смяротнага пакарання: забойства жонкі (арт. 6 раздз. XI Статута 1588), забойства маці ці дачкі (арт. 7 раздз. XI Статута 1588), забойства сястры з мэтай захопу яе пасага (арт. 8 раздз. XI Статута 1588), прымусовы шлюб жанчыны (арт. 13 раздз. XI Статут 1588) і г. д.

Такім чынам, вялікая колькасць спецыяльных нормаў грамадзянскай і крымінальнай галін права у Статутах ВКЛ сведчыла аб тым, што жанчынам надавалася нават больш увагі, чым мужчынам. У жанчын не было палітычных правоў, але аб'ём іх прававога статусу праз гэта не памяншаўся. Яны выступалі асобным суб'ектам права – гэта бачна і ў ужыванні ў Статутах ВКЛ слоў накшталт «шляхцянка», «сялянка», «удава», і ў надаванні ім неахопнага пераліку правоў і свабод, аховы з боку дзяржавы.

***Малиновский А. А.***

## ВЛИЯНИЕ ВНУТРЕННЕЙ ПОЛИТИКИ И ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО НА ФОРМИРОВАНИЕ ВЕЛИКОКНЯЖЕСКОЙ РАДЫ

*Малиновский Андрей Александрович, студент 2 курса Белорусского государственного университета, г. Минск, Беларусь, amakhochow@mail.ru*

*Научный руководитель: канд. юрид. наук, доцент Голубева Л. Л.*

Рада Великого княжества Литовского (далее – ВКЛ) в XV–XVI вв. являлась высшим государственным органом в государстве.

Название «Рада» этот высший государственный орган получил в 1445 г. в период регентства над Казимиром Ягеллончиком, во время которого рада ВКЛ сильно укрепила свои позиции на внутриполитической арене.

В XIII–XIV вв. и в начале XV в. рада ВКЛ называлась консультативным советом при великом князе ВКЛ. Самый первый консультативный совет возник еще при правлении Миндовга (1235–1263) и назывался королевским советом. Изначально состав и компетенция совета не регламентировались. Консультативный совет созывался, как правило, по усмотрению великого князя ВКЛ. Чаще всего в его состав входили родственники монарха, подвластные ему князья и наместники. В XIII в. совет выполнял роль вспомогательного органа. Но в дальнейшем его роль в решении государственных вопросов возростала. Уже в конце XIV в. начал формироваться постоянный состав консультативного совета. В 1387 г. в состав консультативного совета вошли католические епископы, а в 1413 г. постоянный состав совета пополнился представителями Виленского и